**Комплекс мер па падрыхтоўцы настаўнікаў замежных моў да профільнага навучання на ІІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі**

**Перспектывы** развіцця айчыннай моўнай адукацыі ў рамках вучэбнага прадмета “Замежная мова” звязаны з арганізацыяй ***профільнага навучання*** на ІІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі (Інструктыўна-метадычнае пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь “Аб арганізацыі профільнага навучання на ІІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі” ад 22.05.2015 № 05-21/90-і). Згодна вышэйназванаму дакументу, “да пачатку 2015/2016 вучэбнага года ўсе педагагічныя работнікі, якія будуць працаваць у профільных класах, ***павінны павысіць сваю кваліфікацыю*** (у рамках курсавой падрыхтоўкі, навучальных курсаў або іных формах). Суадносна з патрабаваннямі і рэкамендацыямі Міністэрства адукацыі і па запытах педагагічных работнікаў, якія выкладаюць замежную мову, у Дзяржаўнай установе адукацыі “Акадэмія паслядыпломнай адукацыі” створаны **комплекс мер** па забеспячэнню пераходу да профільнага навучання.

Старт падрыхтоўкі да выкладання педагогаў-замежнікаў ва ўмовах профільнага навучання адбыўся ў перыяд з **11 па 15 мая 2015 года, калі** праводзілася ***павышэнне кваліфікацыі*** метадыстаў інстытутаў развіцця адукацыі, рай(гор)методкабінетаў, педагагічных работнікаў, якія з’яўляюцца кіраўнікамі метадычных фарміраванняў настаўнікаў замежных моў, па тэме “Сучасныя вучэбныя заняткі па замежнай мове”. Педагогі, якія прымалі ўдзел у павышэнні кваліфікацыі, мелі магчымасць вылучыць напрамкі развіцця асобы ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу ва ўмовах пераходу да профільнага навучання, выявіць недахопы і складанасці, а самае галоўнае – падзяліцца эфектыўным вопытам асабістай педагагічнай дзейнасці па выкладанні замежнай мовы на павышаным узроўні. У час павышэння кваліфікацыі, **12 мая 2015 года,** дапаўняльна арганізоўвалася правядзенне ***Рэспубліканскага семінара*** “Навукова-метадычныя аспекты ўвядзення профільнага навучання: павышаны ўзровень вывучэння замежнай мовы на ІІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі” для метадыстаў абласных і раённых структур, якія з’яўляюцца куратарамі настаўнікаў замежных моў, кіраўнікоў метадычных аб’яднанняў настаўнікаў замежных моў. На семінары гутарку праводзілі Бабінская П.К., загадчык кафедры педагогікі і методыкі вышэйшай школы установы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт”, кандыдат педагагічныз навук, прафесар, і Дземчанка Н.В., намеснік дырэктара інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў установы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт”, кандыдат педагагічныз навук, дацэнт. Мэтай рэспубліканскага семінара было давесці да педагагічнай грамадскасці краіны нарматыўных дакументаў і змен у змесце вучэбных праграм па замежных мовах для 5 і 10 класаў, якія прызваны забяспечыць передпрофільнае і профільнае навучанне, пачынаючы з 2015/2016 навучальнага года. Лектарам была прадастаўлена магчымасць выявіць існуючыя на месцах складанасці і недахопы ў выкладанні замежнай мовы ва ўмовах пераходу да профільнага навучання.

У дапамогу настаўнікам англійскай, нямецкай, французскай, іспанскай моў на пачатку **2014/2015 навучальнага года** у акадэміі быў выпушчаны ***зборнік практычных заданняў*** да трэцяга этапу абавязковага выпускнога экзамену па завяршэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Згодна з запытамі настаўнікаў англійскай мовы, аўтары з ліку настаўнікаў англійскай мовы рэспубліканскай творчай групы распрацавалі матэрыялы ***як для базавага, так і для павышанага ўзроўняў*** вывучэння прадмета. Выданне зборніка было даслана ва ўсе рэгіёны, а таксама размешчана на сайце акадэміі.

**15-16 чэрвеня 2015 года** па ініцыятыве Міністэрства адукацыі, навукова-метадычнай установы "Нацыянальны інстытут адукацыі" і акадэміі адбылася ***семінар-нарада*** па пытаннях пераходу ў рэспубліцы да профільнага навучання. Мэтай семінар-нарады было абмеркаванне існуючых умоў і падрыхтоўка да пераходу на профільнае навучанне. Акцэнт ставіўся на стан гатоўнасці пераходу на профільнае навучанне ў плане навукова-метадычнага, вучэбна-метадычнага забеспячэння, ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, настаўнікаў-прадметнікаў. Асаблівая ўвага прыцягвалася да выкарыстання эфектыўнага вопыту настаўнікаў-практыкаў.

**З 17 па 22 жніўня**, для настаўнікаў нямецкай мовы праводзілася сумесна з Інстытутам імя Гётэ ў Мінску ***летняя моўная школа*** "Праектаванне педагагічнай дзейнасці настаўніка замежнай мовы з высокаматываванымі вучнямі". Для настаўнікаў англійскай мовы **з 24 па 28 жніўня** арганізоўвалася ***павышэнне кваліфікацыі*** "Праектаванне педагагічнай дзейнасці настаўніка замежнай мовы з высокаматываванымі вучнямі" ў форме летняй моўнай школы. Мэта правядзення мерапрыемстваў накіроўвалася на развіццё ўменняў настаўнікаў замежных моў працаваць ва ўмовах перадпрофільнай і профільнай адукацыі. Па выніках праведзеных мерапрыемстваў у "Настаўніцкай газеце" ад 18.09.2015 быў надрукаваны артыкул В. Барысевіч "З камунікатыўным намерам". Выніковая інфармацыя і фота размяшчалася таксама на сайце акадэміі.

**Перад пачаткам навучальнага года** ў дапамогу метадыстам абласных інстытутаў развіцця адукацыі, раённых і гарадскіх метадычных кабінетаў, кіраўнікам раённых метадычных аб'яднанняў, настаўнікам замежных моў прапанаваліся ***метадычныя рэкамендацыі*** "Рэалізацыя прынцыпаў дыферэнцыйнага навучання замежнай мове ва ўмовах пераходу на профільнае навучанне". Даводзілася ***адрасная тэматыка*** лепшага педагагічнага вопыту **настаўнікаў-метадыстаў** рэспублікі па замежнай мове, колькасць якіх уваходзіць у склад рэспубліканскай творчай групы. Настаўнікі-метадысты прадстаўлены лектарамі, якія маглі па запытах настаўнікаў замежных моў з рэгіёнаў трансляваць вопыт асабістай педагагічнай дзейнасці. Былі азначаны на выбар формы работы: майстар-класы, практычныя заняткі, он-лайн канферэнцыі. Размешчана на сайце акадэміі.

**У жніўні** створана і размешчана на сайце акадэміі ***відэапанарама “Профільнае навучанне вачыма настаўніка”,*** у якой прынялі ўдзел вядомыя ў рэспубліцы настаўнікі замежных моў: Зубрыліна І.У., Караленя Н.Н. (англійская мова), Грушко Н.Д. (нямецкая мова), Шайнова Н.К. (іспанская мова).

У дапамогу настаўнікам замежных моў вядомымі настаўнікамі-практыкамі, якія ўваходзяць у склад рэспубліканскай творчай групы настаўнікаў замежных моў, распрацаваны і размешчаны на сайце акадэміі ***прыкладныя ўзоры вучэбных заняткаў***: ***іспанская мова***, 11 клас. Прадметна-тэматычны змест маўленчых зносін “Дзве мовы – дзве культуры” (***філалагічны профіль***); англійская мова, 10 клас. Прадметна-тэматычны змест маўленчых зносін “Прэса Вялікабрытаніі” (***філалагічны профіль***); англійская мова, 10 клас. Прадметна-тэматычны змест маўленчых зносін “Мабільны тэлефон” (***павышаны ўзровень***); англійская мова, 11 клас. Прадметна-тэматычны змест маўленчых зносін “Знаямітыя людзі нашага горада” (***павышаны ўзровень***); нямецкая мова, 7 клас. Прадметна-тэматычны змест маўленчых зносін “Алімпійскія гульні” (***павышаны ўзровень***); французская мова, 10 клас. Прадметна-тэматычны змест маўленчых зносін “Мастацтва” (***павышаны ўзровень***), **верасень.**

Для настаўнікаў замежных моў з **19 кастрычніка па 18 снежня** прапаноўвалася ***павышэнне кваліфікацыі*** “Удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў ў працэсе атэстацыі” (***дыстанцыйная форма навучання).*** У час прысутнага тыдня ўдзельнікі павышэння кваліфікацыі мелі магчымасць наведаць вучэбныя заняткі па замежнай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама азнаёміцца з лепшым вопытам педагагічнай дзейнасці настаўнікаў-практыкаў. Слухачам прапаноўвалася самастойнае праектаванне вучэбных заняткаў на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі суадносна з павышаным узроўнем вывучэння з выкарыстаннем шэрагу засвоенага зместу, апрабаваных сучасных педагагічных тэхналогій і спосабаў дзейнасці, а таксама іх абарона.

**2015 год завяршыўся** правядзеннем ***Рэспубліканскага семінара-практыкума*** для метадыстаў інстытутаў развіцця адукацыі, раённых і гарадскіх метадычных кабінетаў, кіраўнікоў творчых груп настаўнікаў замежных моў “Рэалізацыя метадычных аспектаў прадметнага зместу на вучэбных занятках па замежнай мове”, які адбыўся **30 лістапада – 1 снежня.** У рабоце семінара прыняла ўдзел Лапцева Н.Я., дэкан факультэта нямецкай мовы установы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, член рабочай групы пры Міністэрстве адукацыі па стварэнню нарматыўных дакументаў па вучэбным прадмеце “Замежная мова”. Значным унёскам у яе практычных занятках быў акцэнт на змесце нарматыўных дакументаў, менавіта для базавага і павышанага ўзроўняў вывучэння замежнай мовы. Дэманстраваўся таксама эфектыўны педагагічны вопыт ва ўмовах пераходу ***да профільнага навучання***, якім падзяліліся педагогі з рэгіёнаў. Працягам асведамлення ***ў выкладанні на***

***павышаным ўзроўні*** вывучэння паслужылі майстар-класы настаўніка англійскай мовы кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” Зубрылінай І.У. і настаўніка вышэйшай катэгорыі нямецкай мовы Негурэ В.В. Аб выніках правядзення семінара (практычныя матэрыялы і фота ўдзельнікаў) магчыма азнаёміцца на сайце акадэміі.

**Пачатак 2016 года** азнаменаваўся правядзеннем **4 і 5 студзеня “V Каляднага фестывалю – 2016”,** у рамках якога працавала ***секцыя па замежных мовах “Пры навучанні - выхоўваю”***. Настаўнікі з вялікім задавальненнем прынялі ўдзел у майстар-класах, дзе вучыліся працаваць па-новаму: не толькі вучыць вучняў, але і выхоўваць іх сродкамі вучэбнага прадмета “Замежная мова”. Лектарамі-практыкамі быў прадстаўлены эфектыўны педагагічны вопыт ***з павышаным узроўнем*** вывучэння замежнай мовы (Зубрыліна І.У., Брыч В.В., Караленя Н.М., Анішкевіч Л.М.). Пасля праведзенай творчай работы настаўнікаў замежных моў на ўзроўні прадметнай секцыі створаны і размешчаны на сайце акадэміі фотаздымак і артыкул “Пры навучанні – выхоўваю”: вучымся працаваць у настаўніка-метадыста (пасляслоўе да **“V Каляднага фестывалю – 2016”)**.

У перыяд з **22 па 26 лютага 2016 года** праводзілася ***павышэнне кваліфікацыі*** метадыстаў інстытутаў развіцця адукацыі, рай(гор)методкабінетаў, педагагічных работнікаў, якія з’яўляюцца кіраўнікамі метадычных фарміраванняў, настаўнікаў замежных моў “Сучасныя вучэбныя заняткі па замежнай мове”. У час павышэння кваліфікацыі са слухачамі дзяліліся вопытам сваёй педагагічнай дзейнасці настаўнікі-практыкі, якія выкладаюць замежную мову ***на павышаным узроўні*** вывучэння (Караленя Н.М., Табакова Г.Ф., Бераснева А.М., Сеўрукова Т.Ю.). Згодна існуючай новай Канцэпцыі па замежнай мове слухачы мелі магчымасць праектаваць адукацыйны змест вучэбных заняткаў не толькі адносна прадметнага і эмацыянальна-каштоўнаснага аспектаў, але і працэсуальнага. У выніку фармат заліку быў прадстаўлены абаронай асабістага праекту прадметна-тэматычнага зместу маўленчых зносін з павышаным узроўнем вывучэння замежнай мовы суадносна яго аспектаў.

На пачатку навучальнага года ў акадэміі **з 22 по 26 жніўня 2016 года** адбылося ***павышэнне кваліфікацыі*** настаўнікаў англійскай мовы **“Праектаванне педагагічнай дзейнасці настаўніка замежнай мовы з высокаматымаванымі вучнямі”.** Заняткі праводзіла Зубрыліна Інэса Уладзіміраўна, настаўніца англійскай мовы кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст”. Змест вучэбнай праграмы накіраваны на павышэнне якасці валодання педагогамі прадметнай і метадычнай падрыхтоўкай, якія працуюць ***з высокаматываванымі вучнямі ў профільных класах***, а таксама рыхтуюць іх да ўдзелу ў алімпіядзе па замежнай мове.

У час заліку ўдзельнікі павышэння кваліфікацыі абаранялі ўзоры створанага кожным на практычных занятках педагагічнага матэрыялу для павышанага ўзроўню вывучэння. Артыкул “Час і месца сустрэчы змяніць нельга” аб

выніках павышэння кваліфікацыі і фота, а таксама спасылка на педагагічныя напрацоўкі педагогаў размешчаны на сайце акадэміі.
http://zamezhniki1.blogspot.com.by/p/blog-page.html

**Да новага навучальнага года** распрацаваны і размешчаны на сайце акадэміі "Метадычныя рэкамендацыі зместу і арганізацыі метадычнай работы з настаўнікамі замежных моў" на 2016/2017 навучальны год. Асаблівая ўвага дадаецца ***павышэнню якасці моўнай адукацыі*** па вучэбным прадмеце "Замежная мова" ***ў сучасных умовах і свядомасці выбару вучнямі профіля вывучэння***. Распрацаваны прыкладны змест правядзення чатырох паседжанняў метадычных аб'яднанняў настаўнікаў замежных моў.

**26 – 30 верасня** - ***павышэнне кваліфікацыі*** настаўнікаў замежных моў, педагагічных работнікаў, якія з'яўляюцца кіраўнікамі метадычных фарміраванняў ***"Рэалізацыя зместу і сучасных метадычных падыходаў да выкладання прадмета на базавым і павышаным узроўнях".*** Мэта правядзення – забяспечыць гатоўнасць педагагічных работнікаў да рэалізацыі зместу і сучасных метадычных падыходаў на вучэбных занятках па замежнай мове ва ўмовах профільнага навучання.

**22 - 23 лістапада** для метадыстаў інстытутаў развіцця адукацыі, рай(гор)методкабінетаў, педагагічных работнікаў, якія з'яўляюцца кіраўнікамі метадычных фарміраванняў і творчых груп настаўнікаў замежных моў, правядзены Рэспубліканскі тэматычны семінар ***"Праектаванне педагагічнай дзейнасці настаўніка замежнай мовы па рэалізацыі дапрофільнай падрыхтоўкі і профільнага навучання".*** Праграма семінара прадугледжвала як прадстаўленне эфектыўнага педагачічнага вопыту, так і вылучэнне існуючых праблемных пытанняў і напрамкі дзейнасці педагогаў па іх станоўчых рашэннях.

**27 – 28 лютага 2017 года** для намеснікаў дырырэктара ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, якія адказваюць за выкладанне замежнай мовы, і педагагічных кадраў, якія забяспечваюць метадычнае кіраўніцтва профільнага навучання замежнай мовы, праведзены абагульняючы Рэспубліканскі тэматычны семінар ***"Рэалізацыя сучасных падыходаўі тэхналогій у выкладанні замежнай мовы ва ўмовах профільнага навучання".*** Заяўленая тэма рэкамендавалася да абмеркаванн, фарміравання і распаўсюджвання эфектыўнага вопыту дзейнасці настаўнікаў замежных моў рэспублікі на працягу астатніх двух навучальных гадоў. Цікава было не толькі падзяліцца эфектыўным вопытам работы настаўнікаў-практыкаў, але і азнаёміцца з сістэмай мер па стварэнні ўмоў для дзейснасці профільнага навучання на абласным, раённым, школьным узроўнях.

У вышэйпералічаных мерапрыемствах за перыяд справаздачы прынялі удзел спецыялісты ў колькасці 3**87 педагогаў**, якія ўваходзяць у склад настаўнікаў замежных моў і могуць з'яўляцца ***лектарамі па пытаннях дапрофільнай падрыхтоўкі і профільнага навучання.***

**У жніўні 2017 года** плануецца павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў англійскай мовы ў форме моўнай летняй школы. Тэма мерапрыемства –

***“Асаблівасці выкладання замежнай мовы ва ўмовах профільнага навучання”.***